Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія КАДРЫ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 4 (217) | Чацвер, 3 сакавіка 1955 года | Цана 20 коп.

ВЯЛІКАЕ АДЗІНСТВА

Ужо стала традыцыяй, што дзень выбараў у Советы дэпутатаў працоўных совецкі народ адзначае як вялікае свята. Ды і на самай справе гэта вялікае свята, свята нашай дэмакратыі, бо совецкая ўлада—самая дэмакратычная форма праўлення дзяржавай, якая найлепш выказвае волю і жаданні народа,—гаспадара краіны.

Адзінадушна аддаючы свае галасы за кандыдатаў непарушнага блоку комуністаў і беспартыйных, совецкія людзі выказваюць любоў і адданасць сваёй Соцыялістычнай Радзіме, заяўляюць аб поўнай падтрымцы ўнутранай і знешняй палітыкі Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада, якая накіравана на далейшае ўмацаванне магутнасці соцыялістычнага ладу, саюза рабочага класа і сялянства, умацаванне міру і бяспекі народаў.

...Урачыстасць дня выбараў адчуваецца ва ўсім: і ў прыбраных шаўковымі сцягамі вуліцах сталіцы, і ў музыцы, што даносіцца з упрыгожаных выбарчых участкаў, і ў прыўзнятым настроі людзей, якія з самай раніцы спяшаюцца на выбарчыя ўчасткі, каб аддаць свае галасы за лепшых сыноў і дачок народа.

Выбарчы ўчастак № 1, які размяшчаецца ў нашым універсітэце... Над уваходам на чырвоным палотнішчы лозунг: «Няхай жыве Комуністычная партыя Совецкага Саюза, вялікая натхняючая і кіруючая сіла совецкага народа ў барацьбе за пабудову комунізма!» З такімі думкамі аб партыі, аб Радзіме, аб вялікім будучым—комунізме пераступае парог выбарчага ўчастка кожны сумленны совецкі грамадзянін.

Бясконцым патокам да выбарчых урнаў ідуць людзі розных прафесій, якія сваёй натхнёнай працай ствараюць добрабыт нашай дзяржавы. Ідуць маладыя выбаршчыкі, студэнты вышэйшых навучальных устаноў, якія заўтра панясуць святло навукі ў самыя далёкія куткі нашай Радзімы. Нашай моладзі добра вядома, што совецкая краіна—краіна школ і універсітэтаў, краіна самай перадавой у свеце навукі, і што кожны голас за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных—гэта не толькі далейшы росквіт цяжкай індустрыі і сельскай гаспадаркі, але і новыя школы, тэхнікумы, інстытуты. Вось чаму нашы студэнты адзінадушна галасавалі за гэты блок. Вось чаму студэнтка-выдатніца біёлага-глебавага факультэта Марыя Драздоўская, якая галасавала ў гэты дзень упершыню, сказала, што з радасцю і хваляваннем аддае свой голас за родную партыю, якая праяўляе вялікія клопаты аб моладзі.

У дзень выбараў асабліва яскрава праявілася адзінства нашага народа, адзінства яго дум і імкненняў, адзінства народа і партыі.

Ад імя ўсіх прысутных старэйшы выбаршчык на нашым выбарчым участку Савелій Герасімавіч Сідарэнка сказаў, што сваім адзінадушным галасаваннем за народных кандыдатаў мы яшчэ больш умацоўваем нераможны лагер міру, яшчэ цясней згуртоўваем усіх тых, хто стаў пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна і будуе самае светлае грамадства ў свеце—комунізм.

Выбары ў Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных прайшлі ў абстаноўцы высокай палітычнай і працоўнай актыўнасці, гарачага імкнення совецкага народа дабівацца новых поспехаў на карысць нашай Соцыялістычнай Айчыне, ператварыць у жыццё мудрую палітыку Комуністычнай партыі, накіраваную на павелічэнне матэрыяльных і духоўных багацяў соцыялістычнага грамадства.

За мир и счастье!

Дымит асфальт
Февральскою метелью.
Встаёт над Минском
Праздничный рассвет.
И даже—
Старики помолодели,
Встряхнув сегодня
Сединою лет!

А на участке—
Смех и оживленье.
Нет ни одной
Незанятой скамьи.

И голосует
Наше поколенье—
Друзья мои,
Товарищи мои,

За торжество
Счастливой нашей жизни,
За мирный труд
В моём родном краю,
За наш народ,
Идущий к коммунизму,
За Партию
Великую мою!

А. ХАРКЕВИЧ

З найлепшых—найлепшым, з надзейных—надзейным свае галасы аддалі ў гэты дзень мы

★ ★ ★

ГАЛАСУЮЦЬ ЗА ШЧАСЦЕ НАРОДА, ЗА ЯГО ЦУДОЎНАЕ БУДУЧАЕ



Шумнымі і вясёлымі стайкамі накіроўваюцца да выбарчых урнаў юнакі і дзяўчаты—самая шчаслівая моладзь у свеце.

Вось галасуюць сяброўкі Мая Райкіна, студэнтка III курса фізіка-матэматычнага факультэта і Вікторыя Рэмізевіч, студэнтка IV курса гэтага-ж факультэта. Яны апускаюць свае бюлетэні з пачуццём бязмежнай удзячнасці роднай Комуністычнай партыі, совецкаму ўраду і свайму народу за тое, што яны прадаставілі ім, простым совецкім дзяўчынам, усе ўмовы для плённай вучобы сёння і творчай працы ў будучым, для ўсебаковага развіцця іх талентаў і здольнасцей.

Незвычайная ноч плыла над горадам, урачыстая, прадсвяточная. Зусім нядаўна празвінеў апошні трамвай, але перадранішняй цішыні не было. Па-адным, па-двое і групамі з'яўляліся на вуліцах людзі, ішлі, спяшаючыся, да сваіх выбарчых участкаў.

Рабочыя і служачыя, студэнты і хатнія гаспадыні, людзі розных прафесій запоўнілі вестыбюль універсітэта задоўга да пачатку галасавання. Калі куранты па радыё прабілі шэсць, старшыня выбарчай камісіі тав. Бярэзін павіншаваў сабраўшыхся. Наперад выходзіць шырокаплечы, з густой доўгай барадой выбаршчык. Гэта барада ў яго засталася з незабыўных дзён, калі ён быў камандзірам партызанскага злучэння. Цвёрдым ясным голасам, у якім адчуваецца моц і сіла, не раз падымаўшым ў атаку байцоў-партызан, Савелій Герасімавіч Сідарэнка гаворыць:

— Сёння дзень вялікай урачыстасці. Мы выбіраем сваю родную ўладу. Галасуючы за лепшых сыноў і дачок майго народа, я галасую за наш слаўны Цэнтральны Камітэт, за мірную палітыку нашага ўрада, за тое, каб з года ў год квітнела наша Радзіма.

На змену густому басу празвінеў малады мілагучны галасок:

— Я доўга рыхтавалася да гэтага дня. Сёння я галасую ўпершыню. З радасцю аддам я свой голас за шчасце народа, за яго светлую будучыню.

Чырванню разгараўся дзявочы твар. Марыйка паважна адышла да сябровак.

— Малайчына! Не разгубілася,—падбадзёрылі яе тыя.

— Але. Яна ў нас і выдатніца, і сяброўка добрая і, наогул...

— А што—наогул?—засмяяліся вакол.

Адказу не ўдалося пачуць. Людскі паток падхапіў усю групу дзяўчат. За сталом яны атрымалі бюлетэні. Маленькія белыя лісточкі апускаюцца ў урну. Апускае свой і Марыйка Драздоўская, студэнтка першага курса біялагічнага факультэта. А за ёй групай галасуе дзесяты пакой корпуса «Б»: А. Акушэвіч, С. Лемеш, Л. Кірчэнка, Н. Котляр, і А. Еўсевіцкая—студэнткі III курса фізмата.

Як і ў папярэднія гады, у ліку першых прагаласавалі хатнія гаспадыні Паліна Васіл'еўна Гускіна і Анна Іванаўна Разуменка з дому № 1 па Ленінградскай вуліцы.

Да 10 гадзін прагаласавала большасць выбаршчыкаў.

У адзіным патоку ідуць студэнты, служачыя, рабочыя. Сваёй формай рэзка вылучаюцца чыгуначнікі. Вось адзін з іх, пэўна толькі звярнуўся з чарговага рэйсу, з крыху стомленым тварам і пачырванелымі ад бяссоніцы вачыма. Ён прышоў на выбарчы ўчастак разам з дачкой Людай. Дзяўчынку бацька адвёў у дзіцячы пакой. Студэнткі IV курса біялагічнага факультэта М. Фёдарава і А. Клебановіч ласкава сустрэлі яе, распранулі і пасадзілі іграць у лато разам з другімі дзяўчынкамі. Весела было дзецям у гэтым пакоі. Хто «чытаў» казку ира рэпку, хто расказваў верш, хто спяваў. Хлопчык у марской форме зачараванa глядзеў на самалёт, безупынна лапатаўшы сваімі крыламі, заклапочана вадзіў пальчыкам па яго серабрыста-блакітнай паверхні.

— А мой тата вайсковец. Ён галасуе не тут,—паведамляе маленькая дзяўчынка.—А я вось праз колькі год тут прагаласую.

— Добра, добра, прагаласуеш, а цяпер пара дадому збірацца. Яе бабуля Паліна Васільеўна звярнулася да нас:—«Ведаеце, ніяк не магу адвесці яе дадому. Спадабалася ёй тут. Пакуль яна гуляла, я і канцэрт праслухала. Добра «Уральскую рабінушку» спявалі. Полька карэла-фінская за душу бярэ, а вось канферанс не спадабаўся. Вельмі ўжо нязграбна і неяк бездапаможна выступаў ён. Аж мне, старой, няёмка стала.

Яны праходзяць праз вестыбюль, дзе не змаўкае музыка, смех. Міма плаўна праплывалі пары за парай.

Паліна Васільеўна з зайздрасцю глядзела на маладых і думала: «Шчаслівыя! А ці такая была мая маладосць»,—бабуля ўздыхае. Ад весялосці дзяўчат і юнакоў твар яе пачынае святлець, маршчыны разгладжваюцца. Яна пяшчотна гладзіць па галаве сваю ўнучку і гаворыць:

—Памятай, Алачка, што гэта і за тваё шчасце, за мірнае і радаснае дзяцінства такіх, як ты, прагаласавала сёння ўся краіна.

Т. КРАЧКОЎСКАЯ.

Ля выбарчых урнаў выкладчыкі і студэнты, чыгуначнікі і хатнія гаспадыні. Усіх іх родняць адзіныя пачуцці, адзіныя думкі, усім ім бязмежна дарага іх родная краіна, першая ў свеце пабудаваўшая соцыялістычнае грамадства.

Адзін за другім ідуць выбаршчыкі, ідуць галасаваць за шчасце свайго народа, за перамогу комунізма.

Ад шчырага сэрца

27 лютага было святам усіх працоўных нашай Радзімы. Совецкія людзі ажыццявілі сваё пачэснае права—выбіраць вышэйшы орган дзяржаўнай улады—Вярхоўны Совет БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. З вялікім хваляваннем я чакала гэтага дня, каб аддаць свой голас за шчасце любімай Радзімы. І вось ён наступіў, доўгачаканы непаўторны дзень у маім жыцці.

Дачка простага рабочага, я маю права, якое дано ўсім совецкім грамадзянам. Мая любімая Радзіма з мацярынскімі клопатамі адчыніла перада мной дзверы вышэйшай навучальнай установы нашай рэспублікі—Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Зараз я займаюся на I курсе. Часта мне прыходзіцца думаць аб сваёй прафесіі. І я ўпэўнена, што лепшая мара майго жыцця—стаць добрым спецыялістам-хімікам, каб прынесці як мага больш карысці свайму народу, збудзецца.

Галасуючы за нашых кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, я галасавала за светлую будучыню свайго народа, за мір і дружбу ва ўсім свеце.

Ад усёй душы, ад шчырага сэрца я дзякую нашай роднай Комуністычнай партыі і совецкаму ўраду за тыя вялікія правы, якія яны далі мне і майму народу.

Л. КАВАЛЁВА,
студэнтка I курса хімічнага факультэта.

БУДЗЬ ДОБРЫМ СПЕЦЫЯЛІСТАМ СПРАВЫ,

★ ★ ★

САМАСТОЙНЫЯ КРОКІ

Восьмы «Г» клас 41-й школы Мінска. На сцяне развешаны шматлікія схемы і ілюстрацыі па анатоміі і фізіялогіі чалавека. На стале стаіць нервова-мышачны прэпарат для правядзення эксперыментаў. Празвінеў званок на ўрок, і ў клас паспешліва ўвайшла Людміла Кішчанка, студэнтка V курса біёлага-глебавага факультэта.

На задніх радах парт сядзелі яе сяброўкі: Тамара Малчанава, Клара Кофман, Анна Акуловіч, выкладчыца біялогіі Соф'я Канстанцінаўна Лук'яновіч і кіраўнік практыкі прафесар Г. С. Юньеў.

Клас пачаў памалу заціхаць. Люда зірнула на Соф'ю Канстанцінаўну і, сустрэўшы на яе твары падбадзёрваючую ўсмешку, пачала:

— Падумайце, рэбяты, над такім пытаннем...

Тут хутка зашамацелі старонкі падручнікаў, пасыпаліся адзін да другога паспешлівыя пытанні.

— Кнігі зараз-жа схавайце,— строга прагучэў голас пачынаючай настаўніцы. Кнігі паволі пачалі закрывацца. Адразу-ж адчулася: будучы педагог узяў клас у свае рукі.

— Пойдзе адказваць Шкамбалава,—Людміла паглядзела на гадзіннік: як хутка ідзе час, а трэба-ж паспець апытаць трох вучняў.

Знешне спакойна выслухоўвае дзяўчына адказ вучаніцы, а ў свядомасці б'ецца неадлучная думка: як зацікавіць клас? як узбудзіць у ім актыўнасць, каб думаў не той, хто адказвае, а ўсе?

Люда задае пытанне вучаніцы, але тая адказвае не зусім трапна, не так чотка. І Люда звяртаецца да ўсяго класа:

— Хто лепш ведае гэтае пытанне?

Падымаюцца рукі. Вучні з месца папраўляюць таварыша. Клас мала-памалу пачынае ажываць. Усё больш рук цягнецца ўверх.

Але вось апытванне закончана. Людміла на хвіліну задумваецца: ці так яна ўсё зрабіла? ці не праблытала чаго? ці правільна вяла сябе?

Зноў паглядзела ў бок Соф'і Канстанцінаўны—тая з адабрэннем заківала галавой. І Люда пачала тлумачыць вучням новы ўрок. Ёй трэба расказаць класу аб нервовай сістэме чалавека і жывёл. Дзяўчына ўпэўнена і чотка вядзе расказ. Адчуваецца глыбокае веданне прадмета. Але трэба ўвесь матэрыял урока падаць так, каб вучні нічога не прапусцілі, усё зразумелі.

Падышоўшы да схем, Людміла яшчэ раз наглядна тлумачыць свой расказ. І клас пачынае разумець маладога педагога. Усе сціхлі, канцэнтраваўшы ўвагу на тым, што гаворыць і паказвае маладая выкладчыца.

— А зараз праробім усё гэта на доследзе,—Людміла падыходзіць да стала, бярэ прэпарат і паказвае пры дапамозе яго, як знешняе ўздзеянне раздражае нервовую сістэму жабы. Рухі Людмілы хуткія і ўпэўненыя.

...Гэта быў другі практычны ўрок Людмілы Кішчанка, сталінскай стыпендыяткі. На працягу пяці год рыхтавалася яна да сваіх першых урокаў у школе. Людміла заўсёды разумела, што педагогу-біёлагу неабходна не толькі глыбока ведаць свой прадмет, але і ўмець усё паказаць доследным шляхам, эксперыментальна. І студэнтка ўпарта рыхтавалася да гэтага. Падоўгу сядзела яна над вопытамі ў лабараторыі фізіялогіі раслін і жывёл. Так паступова набывала яна неабходныя веды.

Напярэдадні гэтага ўрока Людміла грунтоўна распрацавала план, акрамя падручнікаў прачытала многа дадатковай літаратуры, склала канспект урока. Часта яна звяртала-ся за парадамі да прафесара Г. С. Юньева і выкладчыцы біялогіі С. К. Лук'яновіч.

...Даследаванне зацікавіла рэбят. У класе наступіла яшчэ большае ажыўленне. «Пакажыце яшчэ раз»,—раздаліся галасы.

Закончыўшы тлумачэнне ўрока, Людміла зноў глядзіць у бок Соф'і Канстанцінаўны і пытае:

— У каго маюцца пытанні?

Цішыня. «Смялей!»—падбадзёрваючы глядзіць маладая настаўніца на клас. Спачатку нясмела падымаецца некалькі рук, потым лес рук расце ўсё больш і больш. Адзін, другі, трэці—усё больш і больш пытанняў.

Празвінеў званок. Урок закончыўся. Раптам з-за парт выбягаюць вучні і акружаюць Людмілу. З усіх бакоў сыплюцца да яе шматлікія запытанні: чаму? як? адчаго? І Людміла увесь перапынак гутарыць са школьнікамі, адказвае на іх пытанні...

Пасля званка ўсе сабраліся для абмеркавання ўрока. Першымі выказваюць свае заўвагі сяброўкі Люды. Клара гаворыць, што Людміле больш увагі трэба ўдзяляць на вымаўленне, Тамара,—што трэба даваць больш ясныя і поўныя адказы на запытанні вучняў. Але ў цэлым урок сяброўкі іх вельмі задаволіў. Да іх думкі далучаюцца выкладчыца і прафесар. Урок быў праведзены на патрэбным узроўні. Адчувалася ўпэўненасць у тлумачэнні матэрыялу. Асабліва добра тое, што студэнтка не абмежавалася падручнікамі, але і выкарыстала многа пабочнага матэрыялу для тлумачэння тэмы. І, што асабліва ўдала, Людміла Кішчанка змагла зацікавіць урокам увесь клас, узбудзіць у ім актыўнасць. Такім было меркаванне кіраўнікоў практыкі.

Урок Людмілы быў заслужана ацэнены на «выдатна».

В. МАЦКЕВІЧ.

★ ★ ★

н. ГІЛЕВІЧ

ПЕРШЫ ЎРОК

Урачысты, строгі, першы раз,
Я прышоў настаўнікам у клас.
—Добры дзень, рэбяты!—Добры дзень!
Мне насустрач дружны хор дзяцей.
І разгубленасці той нідзе,
Толькі сэрца стукае часцей.
Ды і як тут сэрцу захаваць
У хвіліну гэткую спакой?
Гэта-ж я стаўляю ў дзённік „пяць"—
Першы раз уласнаю рукой.
Гэта-ж я апавядаю быль,
Як вялікі, мужны наш народ
У гады суровай барацьбы
Светлай долі набліжаў прыход.
Колькі ясных поглядаў на мне!
Колькі ў сэрцы радасці жывой!
Дзесяць год, і дваццаць год міне—
Буду помніць першы пробны свой.
Я праводжу сёння першы ўрок
І скажу: у век наш малады
Гэта шчасце—так за крокам крок
Пакаленням аддаваць гады.

Заўвагі кіраўніка

Педагагічная практыка студэнтаў—вельмі важны і адказны перыяд у вучобе. Тут студэнты ўпершыню спрабуюць свае сілы, сустракаюцца непасрэдна з нялёгкай, але высакароднай працай, якой рашылі прысвяціць усё сваё жыццё. Гэта, безумоўна, выклікае хваляванне ў кожнага, хто ўпершыню з'явіўся ў школу не навучэнцам, а педагогам.

Група студэнтаў IV курса рускага аддзялення філфака паспяхова праходзіць практыку ў мінскай сярэдняй школе № 41.

Не без трывогі пераступілі студэнты парог школы. Але ў канцы першага-ж дня практыкі яны ўжо асмялелі, і школа стала здавацца ім знаёмай, роднай, нібы яны тут працавалі даўно.

Практыканты стараліся не толькі атрымаць пэўную практыку, але і дапамагчы школе. Вельмі актыўнымі ў гэтай справе аказаліся студэнты З. Міляновіч, Н. Табачка, Н. Башаркова, К. Лігаева. Яны пазнаёміліся з планам кіраўніка 5 «А» класа, прапанавалі рад новых мерапрыемстваў, размеркавалі паміж сабой даручэнні па правядзенню палітінфармацый, па падрыхтоўцы піонерскіх збораў і дыспута, выказалі жаданне дапамагчы ў выпуску насценнай газеты, у афармленні мантажа.

Студэнты будуць кіраваць самадзейнасцю, наведваць бацькоў навучаючыхся і г. д. Практыканткі З. Солтан, Н. Міласлаўская, Т. Р[illegible]товіч прапанавалі правесці ў 10 «А» класе вечар, прысвечаны Полю Робсану. Адчуваецца, што нашы студэнты любяць вучняў, і школьнікі адказваюць ім тым-жа. І хоць яшчэ не ўсе далі свае першыя ўрокі, важна тое, што пасля кожнага нават вельмі добрага ўрока (напрыклад, Н. Міласлаўская свой першы ўрок правяла як вопытны педагог) студэнты самі лічаць, што можна і трэба іх праводзіць яшчэ лепш.

Такая патрабавальнасць—сведчанне таго, што студэнты і надалей будуць павышаць майстэрства педагога. Пажадаем-жа ім далейшых поспехаў.

Т. МАРТЫНЮК,
выкладчыца універсітэта.

ЗАСЛУЖАНЫ ПОСПЕХ

—З чаго лепш. пачынаць педпрактыку ў школе?—звярнуліся да Яўгена яго сябры.—Якія твае меркаванні?

— Я думаю,—адказаў Яўген,—што тут важна ведаць клас, знаць псіхалогію вучняў, мець да кожнага з іх індывідуальны падыход.

З першых дзён сваёй педагагічнай практыкі ў школе № 33 горада Мінска Яўген Рапановіч, студэнт IV курса філалагічнага факультэта, асабліва ўважліва прыглядаецца да вучняў 8 «А» класа, у якім ён павінен даваць свой першы ўрок. З гэтай мэтай ён завёў спецыяльны сшытак-дзённік, куды заносіў свае назіранні, асобныя заўвагі, думкі. Тыдзень «пасіўнай» практыкі ў школе даў Яўгену Рапановічу пэўнае ўяўленне аб класе.

Але гэта было яшчэ далёка не ўсё. Самае цяжкае заставалася наперадзе. Яўген добра ўсведамляў, што першы ўрок—адказная справа, і ён патрабуе да сябе сур'ёзных адносін. Доўга і старанна рыхтаваўся Яўген да гэтага важнага моманту ў жыцці будучага настаўніка. Ён перачытаў шматлікую метадычную літаратуру, прагледзеў пабочныя дапаможнікі, сабраў багаты фактычны матэрыял, параіўся з метадысткай Дзіанай Пятроўнай Багровай. І напярэдадні першага ўрока Яўген адчуваў сябе ўпэўнена.

З канспектамі і журналам у руках, хаваючы ледзь прыкметнае хваляванне, увайшоў Яўген у клас. Пакуль малады настаўнік адзначаў адсутнічаючых і збіраўся апытваць, узнік яўны шум. Зашушукаліся дзяўчынкі паміж сабой, двое хлапчукоў намерваліся запусціць папяровы самалёт. Яўген на хвіліну разгубіўся: «Поспех урока перш за ўсё залежыць ад яго арганізацыі, ад таго, як будзе пастаўлена дысцыпліна,—успомніў ён наказ завуча школы Алімпіяды Раманаўны Корабавай.—Але што тут рабіць? Трэба прыняць неабходныя меры, устанавіць парадак».

Не трацячы ні адной хвіліны, Яўген тут-жа задае пытанне ўсяму класу:

— Якое значэнне мае творчасць Янкі Купалы?

І адразу-ж:

— Клепікава—да дошкі.

Невялікая, з шэрымі выразнымі вачыма дзяўчынка, якая шумела больш за ўсіх, цяпер загаварыла неўпапад, блытана. Для дапаўнення Яўген адразу-ж выклікаў з месца яшчэ некалькі вучняў. Клас уключыўся ў актыўную работу, і хваля нарастаючага шуму спала.

Аднак выкліканаму вучню перашкаджаў адказваць хлопчык з віхрастым чубам, які сядзеў на пярэдняй парце. Ён круціўся на месцы, спрабаваў нешта падказаць таварышу.

— Працягвай далей расказваць,—перапыніў адказваючага вучня Яўген, звяртаючыся да завадатара непарадкаў. Але ў таго не знайшлося слоў для адказу.

— Сядай і слухай.

Аднак вучань не супакоіўся.

Прыступаючы да тлумачэння новай тэмы «Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа», Яўген расклаў наглядныя дапаможнікі.

— Калі ласка, павесь вось гэтыя малюнкі,—ветліва звярнуўся Яўген Рапановіч да неўтаймаванага свавольніка.

Вучань недаверліва зірнуў на настаўніка, на момант затрымаўся, паволі падняўся і падышоў да стала.

Педагагічны такт быў знойдзены.

Калі Яўген Рапановіч пачаў гаварыць аб дзейнасці вялікага паэта, аб яго вучобе ў Несвіжскай семінарыі, аб працы на глухім Палессі, у класе стала ціха-ціха. Да цікавага біяграфічнага расказа, даступнага па форме, простага, яснага і зразумелага, была добрай ілюстрацыяй павешаная на сцяне табліца з важнейшымі датамі жыцця і творчасці Якуба Коласа, са шматлікімі фотаздымкамі радзімы паэта, рысункамі да кніг і твораў.

— У мінулым годзе я, як член дыялекталагічнай экспедыцыі, быў на Палессі, як раз у тым месцы, дзе некаторы час працаваў настаўнікам Якуб Колас,—расказвае далей Яўген аб сваіх уражаннях ад сустрэчы з тымі людзьмі, якіх вучыў у школе шмат год таму назад вялікі пісьменнік. Апавяданне захапіла ўсіх.

Зазвінеў званок. Вучні неахвотна пакідалі клас, удзячнымі вачыма праводзілі маладога настаўніка.

Так закончыўся першы ўрок. Ён паказаў, што Яўген Рапановіч валодае якасцямі здольнага выкладчыка, выдатна карыстаецца роднай мовай, любіць сваю будучую прафесію, школу, ведае педагогіку і правільна разумее ролю методыкі выкладання мовы. Разам з тым ён выявіў трывалыя веды, набытыя ім у сценах універсітэта.

Аб усім гэтым гаварылі таварышы пры аналізе ўрока.

— Урок Рапановіча заслугоўвае самай высокай ацэнкі,—гаворыць Ольга Андрэеўна Гладкая, выкладчыца беларускай мовы і літаратуры.—Я назвала-б яго прыкладным.

І. ЦІШЧАНКА,
студэнт IV курса філфака.

ЯКОЙ ТЫ ПРЫСВЯЦІЎ СВАЁ ЖЫЦЦЁ!

★ ★ ★

На абмеркаванні ўрока

Паспяхова праходзяць педагагічную практыку ў школах Мінска студэнты нашага універсітэта. Практыка паказвае, што будучыя выкладчыкі атрымалі ў сценах універсітэта трывалыя веды для сваёй настаўніцкай дзейнасці.

На здымку: Абмеркаванне ў трыццаць трэцяй школе ўрока, які дала студэнтка IV курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры **Н. Галушка**.

У абмеркаванні ўдзельнічаюць дырэктар школы **Е. В. Карэпанава** (другая злева), кіраўнік-метадыст **Д. П. Багрова** (у цэнтры) і студэнты групы. Выступае студэнтка **Н. Шкуратава**.

Фота Л. БОНДАРА.

Добрыя вынікі

Паспяхова прайшла практыка ў студэнтаў V курса аддзялення біялогіі. Студэнты далі для вучняў сярэдніх школ па два ўрокі. Акрамя таго, яны наведвалі ўрокі па сваёй спецыяльнасці.

Студэнтка А. Бандарчук была на практыцы ў першай сярэдняй школе, якую яна закончыла пяць год назад. Якасць праведзеных ёю ўрокаў была прызнана выдатнай. Добра праявілі сябе на практыцы ў тойжа школе студэнткі Г. Белая і П. Барадоўская.

На практыку ў 28 школу было накіравана 8 студэнтаў. Сямёра з іх за паўторны ўрок атрымала «выдатна». Асабліва добра адазваліся выкладчыкі школы аб уроку Ніны Сабіла, праведзеным ёю па заалогіі ў 7 класе.

Студэнты арганізоўвалі з вучнямі розныя культурна-масавыя мерапрыемствы. Так, пад кіраўніцтвам В. Арлоўскага адбылася экскурсія шасцікласнікаў у заалагічны музей універсітэта.

А. КАРТАШОВА,
кіраўнік групы.

ЛЕКЦЫЯ АСПІРАНТА

★ ★ ★

— У наступны раз лекцыю замест мяне будзе чытаць аспірант Аляксандр Мажэйка,—на развітанне абвясціў трэцякурснікам выкладчык беларускай мовы Міхаіл Іванавіч Жыркевіч.

І вось месца за кафедрай заняў невысокі юнак з універсітэцкім значком на грудзях і выразнымі рысамі твару. Студэнты прыціхлі. Яны добра адчуваюць і разумеюць хваляванне маладога выкладчыка. Ён-жа сам некалькі год назад сядзеў у гэтай аўдыторыі і канспектаваў лекцыі Міхаіла Іванавіча, які цяпер сядзіць за сталом і ўважліва прыслухоўваецца да слоў маладога выкладчыка. Ён-жа і асабіста ведае амаль кожнага студэнта гэтага курса, дзе яму, як члену камітэта комсамола, часта даводзілася бываць на сходах. Праўда, ды падрыхтоўцы да лекцыі Аляксандр Мажэйка прачытаў многа літаратуры, вышісаў дзесяткі прыкладаў, прагледзеў канспекты Міхаіла Іванавіча. Але-ж нераспрацаваную ў беларускіх падручніках тэму прышлося вырашаць самастойна. І, наогул, нялёгка чытаць першую ў жыцці лекцыю, ды яшчэ калі на цябе патрабавальна глядзіць твой любімы выкладчык, ды яшчэ калі ў цябе з палавінай аўдыторыі адносіны на—ты...

Так, цяжка рабіць першыя крокі маладому выкладчыку. Але Мажэйка бачыць добразычлівыя позіркі трэцякурснікаў, заўважае прышоўшых тайком яго паслухаць сяброўак Рыму Маленчанкаві Іру Кісялёву, у думках успамінае асноўныя палажэнні лекцыі—і хваляванне праходзіць. Цяпер у словах Аляксандра больш не адчуваецца ненатуральнасці, адзеравянеласці. Спяшаючыся, каб укласціся ў кароткія дзве гадзіны, ён расказвае аб утварэнні прыслоўяў, аб іх ролі ў сказе. Расказвае мо' крыху і за хутка—студэнты не паспяваюць усё дакладна запісаць,—але яны выбачаюць яму гэтыя непазбежныя ў першы раз недахопы. Тым больш, што малады выкладчык імкнецца знайсці кантакт з аўдыторыяй:

— Возьмем такі прыклад: «Беражы адзенне знову, а чэсць змаладу»,—гаворыць Аляксандр, ходзячы ўздоўж сталоў. —Дарэчы, да якога твору з'яўляюцца эпіграфам гэтыя словы?

— Да «Капітанскай дачкі» Пушкіна,—ціха адказвае нехта.

— Калі разгледзім прыслоўі ў гэтым сказе...

Але запісаць прыклад на нявыцертай дошцы было немагчыма. Аляксандр крыху разгубіўся: што рабіць у такім выпадку? Папракнуць дзяжурнага? Неяк няёмка. На дапамогу прыходзіць Міхаіл Іванавіч. Пасля яго напаміну староста Зіна Лысак хутка ліквідавала перашкоду.

Пасля перапынку Міхаіл Іванавіч параіў Мажэйку чытаць крыху павольней. Дзякуючы гэтай заўвазе, другая гадзіна ў Аляксандра атрымалася значна лепшай. Студэнты трэцяга курса беларускай мовы і літаратуры засталіся задаволенымі яго лекцыяй.

А праз два дні лекцыя абмяркоўвалася на пасяджэнні кафедры беларускай мовы. Прысутныя станоўча ацанілі гэтую першую лекцыю Аляксандра Мажэйкі, зрабілі яму некалькі крытычных заўваг.

— Бачна, што практыкант сур'ёзна аднёсся да свайго першага вялікага выпрабавання,—сказаў у заключэнне М. І. Жыркевіч.—Лекцыя прайшла на належным навуковым узроўні. З Мажэйкі выкладчык атрымаецца!

Цяпер Аляксандр рыхтуецца да правядзення на тым-жа курсе практычных заняткаў. Паўтара года назад ён закончыў аддзяленне логікі, псіхалогіі і рускай мовы і пастуніў у аспірантуру. За гэты час Аляксандр здаў на «выдатна» ўсе кандыдацкія экзамены, сабраў многа матэрыялу для дысертацыі «Фразеалагічныя звароты ў мове Кузьмы Чорнага». Патрабавальны да сябе і другіх, чулы да таварышаў, Мажэйка ўпарта авалодвае ведамі, каб стаць у будучым сапраўдным вучоным.

А. МАЛЬДЗІС.

Выхаваўцы вучняў

Работа студэнтаў-практыкантаў заключаецца не толькі ва ўмелым выкладанні ўрокаў. Будучыя педагогі павінны праводзіць і масава-палітычную, выхаваўчую работу сярод навучэнцаў.

Гэта і маюць на ўвазе студэнты-філолагі, якія праходзяць педагагічную практыку ў 33-ай школе горада Мінска. Чацвертакурснікі Н. Бранавец, Л. Шурубок, А. Малінін і другія студэнты гэтага курса ўжо ў першыя дні практыкі правялі сустрэчу вучняў з ветэранам Айчыннай вайны капітанам Гусевым, які расказаў аб барацьбе Савецкай Арміі ў часы Вялікай Айчыннай вайны, аб сваім удзеле ў гэтай барацьбе. Рэгулярна праводзяць нашы студэнты палітінфармацыі, дапамагаюць у выпуску насценных газет. Усё гэта цесна збліжае будучых настаўнікаў з вучнямі.

Г. БАРТАШЭВІЧ.

Нашы прэтэнзіі да будучых журналістаў

Звычайна, калі ў памяшканне рэдакцыі з'яўляецца група студэнтаў-практыкантаў, у работнікаў усіх аддзелаў мімаволі ўзнікае пытанне: «А што гэтыя юнакі і дзяўчаты прынеслі з сабой у рэдакцыю, якая будзе ад іх карысць газеце?».

Мы ведаем, што студэнты-практыканты прыходзяць у газету вучыцца, на практыцы замацоўваць тыя веды, якія яны атрымалі ва універсітэце. І мы абавязаны дапамагаць ім у гэтай рабоце. Але, разам з тым, і работнікі газеты чакаюць многага ад практыкантаў, асабліва ад студэнтаў старэйшых курсаў.

У лютым у «Чырвонай змене» практыкавалася група студэнтаў IV курса аддзялення журналістыкі. Прышлі яны ў нашу газету не навічкамі—гэта нашыя старыя знаёмыя А. Чэркасаў і Л. Мірачыцкі, В. Хорсун і А. Харкевіч, якія не аднойчы выступалі ў нашай і іншых газетах. Таму работнікі рэдакцыі з радасцю сустрэлі новае папаўненне, спадзяючыся, што карысць газеце ад гэтых юнакоў абавязкова будзе. Але, як гэта не крыўдна адзначыць, спадзяванні нашы апраўдаліся не поўнасцю.

Галоўны недахоп усіх практыкантаў, які, дарэчы, назіраецца кожны год—гэта вялікае нежаданне студэнтаў працаваць над аўтарскімі матэрыяламі. Апрацоўку пісем аўтараў студэнты чамусьці лічаць несур'ёзнай справай, з пагардай пазіраюць на гэтыя пісьмы і заўсёды імкнуцца як-небудзь пазбавіцца гэтай «чарнавой работы». Часта ад практыкантаў можна пачуць: «Што вы мяне прымушаеце пісьмы апрацоўваць? Мне для справаздачы на практыцы патрэбны свае ўласныя матэрыялы».

Але вось атрымоўвае практыкант тэму, амаль увесь час практыкі працуе над ёй і сяк-так піша артыкул, які потым даводзіцца яшчэ апрацоўваць работнікам аддзела. Артыкул з'яўляецца ў газеце. І сам практыкант і кіраўнік практыкі з універсітэта лічаць, што практыка прайшла нядрэнна: студэнт змясціў у газеце «ўласны» матэрыял. А якую-ж карысць прынесла такая практыка студэнту?

Зразумела, што калі пасля заканчэння універсітэта выпускнікі аддзялення журналістыкі прыдуць у газету, ім не так ужо і часта давядзецца пісаць свае ўласныя матэрыялы. Галоўная работа ў рэдакцыі—тая самая чарнавая, якой так баяцца студэнты-практыканты. І калі яны яшчэ ў сценах універсітэта не навучацца выконваць такую работу, ім потым прыдзецца нялёгка. Часта бывае так, што чалавек, які здолеў напісаць нядрэнную замалёўку або крытычны артыкул, не можа, як след, апрацаваць звычайнага пісьма.

У рэдакцыю пішуць вельмі многа. Пішуць розныя людзі, і пісьмы гэтыя ў большасці выпадкаў патрабуюць дэталёвай пераапрацоўкі. Аўтар часта не можа дакладна выказаць сваю думку, не можа вылучыць галоўнага сярод многіх фактаў. Задача работніка газеты—знайсці гэта галоўнае, дапамагчы аўтару коратка і зразумела выказаць тое, што ён хоча. І работа гэта сур'ёзная і нялёгкая.

Многія з нас, сённяшнія работнікі рэдакцыі, зусім нядаўна былі студэнтамі. І таму мы добра памятаем, што да вынікаў практыкі ва універсітэце адносяцца не зусім правільна. Аб поспехах практыкі звычайна мяркуюць па колькасці змешчаных у газеце ўласных матэрыялаў. На апрацаваныя-ж і арганізаваныя практыкантамі аўтарскія пісьмы і артыкулы звычайна мала звяртаюць увагі. Таму і глядзяць з такой пагардай студэнты-практыканты на аўтарскія пісьмы, з такой неахвотай бяруцца за апрацоўку аўтарскіх пісем, і, як правіла, апрацоўваюць іх дрэнна.

Ёсць у практыкантаў і іншыя агульныя недахопы—гэта адсутнасць самастойнасці, ініцыятывы. Як правіла, студэнты звычайна просяць у работнікаў таго ці іншага аддзела: «Дайце мне тэму!» Або: «Падкажыце, аб чым напісаць!». Ну, такая просьба яшчэ зразумела, калі практыкуюцца студэнты другога курса. Яны яшчэ слаба арыентуюцца ў газетнай практыцы, не зусім ясна ўяўляюць сабе задачы, якія стаяць перад газетай ў даны перыяд.

Студэнты-ж IV курса ўжо самі павінны знаходзіць патрэбныя тэмы, уздымаць важныя пытанні. Яны-ж праз год пойдуць на самастойную работу. Магчыма, многія будуць кіраваць аддзеламі, і тады ім трэба будзе самім думаць над тэмамі і рознымі пытаннямі. Таму студэнтам старэйшых курсаў ужо зараз неабходна вучыцца гэтай самастойнасці ў вырашэнні таго або іншага пытання.

Трэба прама сказаць: група студэнтаў, якая праходзіла ў гэтыя дні практыку ў нашай рэдакцыі, не задаволіла цалкам работнікаў газеты. Толькі В. Хорсун па-сур'ёзнаму адносіўся да ўсіх даручэнняў загадчыка аддзела, выконваў усю работу, якая ад яго патрабавалася. Удумліва і ўмела ён апрацоўваў пісьмы аўтараў, і ўсе яны, як правіла, ішлі ў газету. Пабываўшы ў камандыроўцы ў Гродненскай вобласці, практыкант сабраў там цікавыя факты для нарыса і крытычных артыкулаў. Гэтыя матэрыялы ўжо напісаны ім і ў хуткім часе будуць змешчаны ў газеце. Аб Хорсуне ў рэдакцыі склалася агульная думка: ён будзе здольным газетным работнікам.

А вось Л. Мірачыцкі і А. Харкевіч ужо лічаць сябе вопытнымі журналістамі, якім няма чаму вучыцца, бо яны ўсё ведаюць. Апрацоўваць пісьмы не хацелі ні адзін, ні другі. Мірачыцкі як свой чалавек у рэдакцыі (ён практыкуецца ў нас не ўпершыню і нават працаваў карэспандэнтам) наогул рэдка з'яўляўся ў рэдакцыю, працаваў не ў тым аддзеле, куды яго накіравалі, а там, дзе лягчэй.

Для аддзела студэнцкай моладзі Мірачыцкі зрабіў дзве падборкі заметак. Трэба сказаць, што ўсе яны павярхоўныя і мала цікавыя. А між тым, Л. Мірачыцкі здольны напісаць або арганізаваць і больш сур'ёзныя і важныя матэрыялы. З усяго сказанага можна зрабіць адзін вывад: ва універсітэце павінны больш сур'ёзна адносіцца да практыкі студэнтаў-журналістаў, больш патрабаваць ад іх, навучыць не баяцца чарнавой работы.

Р. САМУСЕНКАВА,
загадчык аддзела студэнцкай моладзі газеты «Чырвоная змена».

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

НА СТУДЭНЦКІХ СПАБОРНІЦТВАХ

Першыя дні канікулаў азнаменаваліся сустрэчай стралковай каманды Маскоўскага інстытута нафты і каманды універсітэта. Каманда нафтавікоў—чатырохразовы чэмпіён Масквы сярод ВНУ. У яе саставе выступаюць такія майстры спорту, як Я. Эмінбейлі—рэкардсмен СССР па дробнакалібернаму стандарту і чэмпіён ДТСААФ, майстар спорту Э. Землякова. Каманда стралкоў універсітэта састаіць у асноўным з маладых спартсменаў.

Сярод мужчын лепшых вынікаў у стральбе з дробнакалібернай вінтоўкі ў стандарце 3×20 дабіліся масквічы Я. Эмінбейлі, М. Ніязаў і студэнт універсітэта Л. Кабановіч, якія выбілі суадносна 564, 554, 552 ачкі з 600 магчымых. У жанчын першыя месцы занялі масквічкі майстар спорту Э. Землякова і Л. Ефрэмава. Трэцяе месца заваявала С. Чарткова (II курс гістарычнага факультэта універсітэта).

У стральбе з пісталета на дыстанцыі 50 метраў студэнтка фізіка-матэматычнага факультэта І. Загорская заняла II месца з вынікам 234 ачкі з 300 магчымых; на дыстанцыі 25 метраў першае месца заваявала студэнтка першага курса аддзялення журналістыкі Маскаленка (91 ачко з 100 магчымых).

* * *

У Львоў на першынство цэнтральнага совета ДСТ «Навука» выязджала каманда плаўцоў універсітэта. Некаторыя студэнты універсітэта адначасова выступалі і за каманду БРС ДСТ «Навука». Спаборніцтвы паказалі дрэнную падрыхтоўку плаўцоў універсітэта і іншых ВНУ рэспублікі.

* * *

Закончылася першынство ВНУ рэспублікі па лыжнаму спорту. У выніку ўпартай трохдзённай барацьбы калектыў лыжнікаў універсітэта заняў агульнае другое месца. Асабліва парадавала сваімі поспехамі студэнтка гістарычнага факультэта Кар'янава, якая абнавіла рэкорд універсітэта на 10 км. Нядрэнных вынікаў дабіліся лыжнікі Холкіна, Нагатаў, Багей, Іўко і другія.

* * *

Цікава праходзіла першынство Беларускай ССР па лёгкай атлетыцы ў зімовых умовах. За зборныя каманды горада выступалі студэнты універсітэта Н. Жуніна, Л. Станішэўскі і І. Дабралюбаў. Трэцяе месца па скачках у даўжыню і па трайному скачку выйграў Л. Станішэўскі. І. Дабралюбаў заняў другое месца ў хадзьбе на 5 км.

А. УХАНАЎ.

ГЛЫБОКА І ЗМЯСТОЎНА АСВЯТЛЯЦЬ СТУДЭНЦКАЕ ЖЫЦЦЁ

(ПА СТАРОНКАХ ФАКУЛЬТЭЦКІХ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ)

Кожная факультэцкая насценная газета павінна быць мэтанакіраванай, ісці ў нагу з жыццём, асвятляць дзейнасць свайго калектыву прадметна, на канкрэтных прыкладах.

Прайшоўшая зімовая экзаменацыйная сесія з'явілася адказнейшым перыядам у жыцці і вучобе нашых студэнтаў. Якое-ж аддзюстраванне знайшла яна ў факультэцкіх газетах? Паўтара месяца пуставалі стэнды газет фізмата (рэдактар Жбанкоў), геолага-геаграфічнага факультэта (рэдактар Хрэнаў), аддзялення журналістыкі (рэдактар Чаргейка), усё яшчэ віншуе студэнтаў з новым годам «Совецкі хімік» (рэдактар Сташонак). Аб якой ролі газеты як калектыўнага агітатара, прапагандыста, арганізатара можна гаварыць у гэтым выпадку?

Паказаць, як планавалі свой працоўны дзень лепшыя студэнты, як яны рыхтаваліся да залікаў, экзаменаў, паказаць так, каб гэта маглі пераняць другія; увесь агонь крытыкі накіраваць на абыякавасць, недобрасумленныя адносіны да заняткаў студэнтаў, атрымаўшых нездавальняючыя адзнакі,—вось што павінны былі зрабіць газеты ў час сесіі і ў першыя дні новага семестра.

Але нават і тыя з насценных газет, што вышлі ў час сесіі, слаба спраўляліся з гэтай задачай. Газета філалагічнага факультэта (рэдактар тав. Захарава) амаль цалкам запоўнена матэрыяламі аб экзаменах. Аднак колькасны склад матэрыялаў ні ў якай меры не выратоўвае іх якасці. Здзіўляе агульны план і стыль гэтых шэрых абыякавых інфармацый: спачатку называюцца выдатнікі, потым адказваўшыя слабей, і, нарэшце, тыя, хто адказвае дрэнна. Часта прадстаўнікі апошніх катэгорый нават пазбаўляюцца прозвішчаў: **«Некаторыя студэнты адказвалі ніжэй сваіх магчымасцей»** і г. д.

Ніякай карысці ад такіх матэрыялаў няма. Замест пераліку прозвішчаў выдатнікаў варта было-б паказаць, у выніку чаго атрымана «выдатна», раскрыць індывідуальны метад працы выдатнікаў, зрабіць гэты метад агульнадаступным, павучальным. Цікавай і патрэбнай у гэтым сэнсе з'явілася замалёўка «Первый экзамен Ады Радецкой», змешчаная ў газеце «За мичуринскую биологию» (рэдактар Карташова). На жаль, другія матэрыялы і гэтай газеты адрозніваюцца тымі-ж недахопамі, што і матэрыялы «Слова філолага». Галоўны з іх—амаль поўная адсутнасць крытычных выступленняў, крытыка наогул, калі тыя або іншыя недахопы прыпісваюцца ўсяму калектыву, а не канкрэтным віноўнікам, калі абвінавачванні прад'яўляюцца бездоказна, неабгрунтавана. **«К сожалению, не все студенты отвечали хорошо», «Отдельные студенты сравнительно легко отнеслись к изучению основ марксизма-ленинизма»,**—піша газета «За мичуринскую биологию». Крытыка такога роду ў вышэйшай ступені бязмэтна.

Недахопам гэтых-жа газет з'яўляецца няўменне рабіць абагульненні з фактаў, наіўны, трафарэтны характар змешчаных у іх матэрыялаў. **«Экзамен паказаў, што тыя студэнты, якія сістэматычна займаліся на працягу года, добра адказвалі на экзаменах»,**—піша «Слова філолага». Такі вывад не дае канкрэтных вынікаў з таго ці іншага экзамена. Што можна-б было перадаць другім студэнтам, якія здаюць гэты-ж курс, чаго пазбягаць—усё гэта выпала з поля зроку газеты.

Зніжаюць якасць газет частая блытаніна, недакладнасць фармуліровак, дрэнна адшліфаваны стыль. **«Надо усилить внимание комсомольской общественности к подготовке к семинарским занятиям и даже к отношению к лекционному курсу со стороны таких товарищей, заставить их работать во всю силу своих возможностей»,** — піша газета «За мичуринскую биологию».

Насценны друк—адзін з мацнейшых сродкаў комуністычнага выхавання нашага студэнцтва. Партыйныя, комсамольскія арганізацыі факультэтаў павінны больш дзейсна кіраваць сваімі насценнымі газетамі, забяспечыць рэгулярны выхад іх, узняць ідэйны і культурны ўзровень змяшчаемых матэрыялаў, дабіцца таго, каб газеты больш глыбока і змястоўна асвятлялі студэнцкае жыццё.

„Прыбіральшчыца не стварае належных умоў..."

Калі камісія на чале з прарэктарам па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы т. Бярэзіным увайшла ў адзін з пакояў інтэрната на Бабруйскай вуліцы (корпус «А»), то, акрамя вельмі цяжкага паветра і страшэннага бруду, усіх здзівіла акамянелая нерухомасць студэнтаў, жыхароў гэтага пакоя. Седзячы ў смецці, ахутаныя клубамі папяроснага дыму, яны уткнуліся ў разгорнутыя кнігі, якія, дарэчы, плавалі ў лужах вады, разлітай на стале.

— Дзень добры,—звярнуліся да іх увайшоўшыя. Ні гуку ў адказ. Свет не існаваў для гэтых нерухомых фігур, нішто не паказвала ў іх прыкмет жыцця. Толькі адзін ускудлачаны сілуэт гультаявата ўзняў галаву і, выпусціўшы струмень дыму ў бок увайшоўшых, зноў углыбіўся ў чытанне.

— Як ваша прозвішча?

— Маё?!—спытаў сілуэт.—Гаўрылаў.

— А з якога курса?

— З трэцяга фізмата,—і, незадаволена зморшчыўшы твар, Гаўрылаў павярнуўся да ўвайшоўшых спіной, жадаючы паказаць, што размова скончылася.

— Зноў прышлі, — прабурчэў студэнт-журналіст Пташнікаў, калі камісія зайшла ў пакой № 73. Для паказу сваёй абыякавасці да членаў камісіі ён дэманстратыўна засвістаў марш. Калі яму зрабіў заўвагу адзін з членаў камісіі, Пташнікаў адказаў:

— Гэта я для заспакаення нерваў. Вельмі ўжо ўсё раздражае,—і засвістаў яшчэ гучней, але ўжо не адзін, а ў дуэце са сваім сябрам Чыгрынавым.

Пакой № 78 таго-ж корпуса нагадваў смеццевую яму. Жыве там 9 студэнтаў: Ліфшыц, Вайтовіч, Жмойдзіч, Георгіеў, Машэнкоў, Лепяшкоў, Мячкоўскі, Плюшчэўскі і Шахоцька. Ніводзін з ложкаў не быў прыбраны. Груды паперы, аб'едкі пакрывалі падлогу, стол, падаконнікі. Мабыць, спачатку намячалася ўсё смецце зваліць пад ложак студэнта Ліфшыца, але гэтага месца аказалася малавата, і таму смецце распаўзлося па ўсім пакоі. Нясцерпная вонь вырывалася з шафы, дзе за акуратна пагладжанымі клёшамі была схавана каструля з супам, які варыўся яшчэ ў пачатку першага семестра.

У пакоі № 43, у якім жывуць аспіранты, камісію сустрэў важны на від жыхар. Пераскокваючы праз груды смецця, без пяці мінут кандыдат навук паспешліва збіраў у папку нейкія бумагі.

— Чаго вы вылупіліся?—накінуўся ён на членаў камісіі.—Прыбіральшчыца не стварае належных умоў для жыцця—вось у чым справа.

— А чаму-б вам самім не падмесці іншы раз?

— Шт-о-о?! Ды вы ўяўляеце, хто мы? Аспіранты!—І жрэц навукі, пераскокнуўшы праз неразвернуты кошык з бумагамі, пакінуў пакой.

Пакой дзяўчат № 35 нагадваў сушылку гарадской пральні. На вяроўках, якія былі нацягнуты ў некалькі ярусаў, сушылася бялізна. Студэнтка Грынько (III курс хімфака) старанна развешвала змочаны адрэз штапельнага палатна, з якога струменьчыкамі збягала вада.

— Што вы робіце?—спыталі члены камісіі.—Вада-ж працячэ ў ніжні паверх.

— Нічога,—спакойна заўважыла Грынько,—там зараз нікога няма, усе на занятках.

Так жывуць і вядуць сябе ў быту некаторыя з нашых таварышаў. І гэтыя-ж людзі прэтэндуюць на тое, каб у недалёкім будучым стаць выхаваўцамі нашага падрастаючага пакалення.

А. ПЯТРОЎСКІ.

На фізіка-матэматычным факультэце

З кожным годам паляпшаецца абсталяванне фізічных кабінетаў фізіка-матэматычнага факультэта. Так, днямі набыта рэнтгенаўская ўстаноўка для атрымання рэнтгеноструктурнага аналізу. Упершыню пасля вайны будуць праведзены работы па даследаванню кантактных з'яў у поўправадніках. Атрыманы нядаўна ртутны выпраміцель магутнасцю каля 300 кілават дасць магчымасць забяспечыць лабараторыі пастаянным токам.

Набыты таксама кварцавы спектрограф ІСП-22, мікрафотаметр і другія прыборы.

Усё гэта, бесспрэчна, палепшыць правядзенне практыкі студэнтаў факультэта.

* * *

У пачатку гэтага семестра пры кафедры тэарэтычнай фізікі пачаліся заняткі па наступных спецыяльнасцях: квантавая электрадынаміка, тэорыя электрадынамікі, тэорыя элементарных часціц квантавай статыкі.

Студэнты, спецыялізуючыся ў гэтых галінах навукі, атрымоўваюць глыбокія веды і практычныя навыкі па сучасных праблемах тэарэтычнай фізікі.

* * *

Больш году працуе гарадскі семінар па тэарэтычнай фізіцы пад сумесным кіраўніцтвам дацэнтаў І. З. Фішара і Ф. І. Фёдарава. Пачаў працаваць і гарадскі матэматычны семінар, якім кіруе прафесар А. Д. Мышкіс.

І. АФАНАСЬЕЎ.

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 01238 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыраж 1000 экз. Зак. 151